ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 1 (1073) 5 студзеня 2013 г. Кошт 4000 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

З Новым годам і Раждаством! 2013

У нумары — традыцыйны навагодні падарунак ад "К"! Глядзіце і чытайце на стар. 3 — 15.

Шаноўныя сябры!

Мы ўзнаўляемся, але і ў вашых вёсцах, мястэчках ці гарадах захаваны непаўторныя абрад альбо традыцыя, рамяство альбо тэхналогіі! Мяркуем, яму таксама ў будучыні знойдзецца месца і на палосах газеты "Культура". Пішыце нам, расказвайце пра свае здагадкі!

220013, г. Мінск, пр-т. Незалежнасці, д. 77

А ў гэты фрагмент газетнай плошчы прапануем зняволіць фота вашага аўтэнтычнага калектыву, абраду ці традыцыі!

Праваслаўным хрысціянам Беларусі Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую вас са светлым святам Ражджаства Хрыстовага.

На працягу больш чым двух тысячагоддзяў мільёны людзей з радасцю і надзеяй звяртаюць свае мысленныя погляды да гэтай падзеі, якая стала пераломным момантам у духоўным жыцці чалавецтва. Евангельскія ідэалы служаць для нас непарушным маральным законам, які пабуджае здзяйсняць велікадушныя ўчынкі і пераўтвараць навакольны свет.

Ражджаство не выпадкова з'яўляецца адным з самых любімых святаў на беларускай зямлі. Бо Праваслаўная царква заўсёды была побач з народам, адыграла важную ролю ў станаўленні дзяржаўнасці і фарміраванні характару беларусаў. І сёння яна з'яўляецца нашым надзейным памочнікам у сацыяльным служэнні, справах міласэрнасці і асветы.

Няхай жа гэтыя цудоўныя зімовыя дні прынясуць у вашы дамы і сем'і згоду і ўзаемаразуменне, росквіт і дабрабыт, словы любові і дзіцячы смех. Няхай ззянне ражджэсцвенскіх зорак увесь год натхняе вас на добрыя справы і стваральную працу ў імя роднай Беларусі.

Здароўя, радасці, поспехаў і шчасця вам, дарагія сябры.

З Ражджаством!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА
7 студзеня 2013 года

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — члены Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы шчыра віншуюць работнікаў культуры, дзеячаў мастацтва і ўсіх чытачоў газеты "Культура" з Калядамі і Новым 2013 годам!

Прыемна адзначыць: менавіта дзякуючы вашай працы традыцыі святкавання гэтых светлых і радасных дзён на беларускай зямлі маюць свой нацыянальны каларыт, прымнажаюцца і захоўваюцца. Дазвольце сказаць вам, дарагія работнікі культурнай нівы, словы падзякі за вашу самаадданасць любімай справе, за прыгажосць і духоўнасць, якімі вы руплівa напаўняеце сучаснае жыццё беларусаў, робіце яго больш змястоўным і прыгожым.

Ад усёй душы жадаем вам моцнага здароўя, асабістага шчасця і дабрабыту. Няхай новы год будзе шчодрым на творчае натхненне, прынясе новыя поспехі і дасягненні на карысць беларускага народа.

Старшыня камісіі Генадзь ПАЛЬЧЫК

Майстар-клас з маэстра

18 студзеня сёлетні фестывальны сезон адкрывае Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны Міхаіла Фінберга. Паводле добрай традыцыі, першым у размаітым спісе сёлетніх імпрэз будзе фэст у старажытным Заслаўі — ужо 13-ы па ліку. І, зважаючы на мастацкую ды арганізацыйную якасць усіх мерапрыемстваў калектыву, "нешчаслівасць" гэтага ліку можна смела аднесці да беспадстаўных забабонаў.

Як распавёў нашаму карэспандэнту маэстра Міхаіл Фінберг, сёлетні фэст — ізноў жа, па добрай традыцыі, — будзе прысвечаны класіку беларускай акадэмічнай музыкі і стане важнай падзеяй у адзначэнні 100-годдзя з дня нараджэння народнага артыста СССР Анатоля Багатырова. Праграма калектываў аркестра будзе, як заўсёды, эксклюзіўнай — адпаведна, аматараў "сур'ёзнай" беларускай музыкі чакае мноства сюрпрызаў.

У той самы час, фестываль у Заслаўі мае і асветніцкае значэнне. Ужо не ўпершыню ў яго рамках адбудзецца конкурс навучэнцаў музычных школ Міншчыны.

— Мэта ўсіх нашых фестываляў — папулярызацыя нацыянальнай музыкі, — адзначыў Міхаіл Фінберг. — І таму навучэнцы будуць спаборнічаць у выкананні інструментальных п'ес беларускіх кампазітараў.

Ёсць усе падставы меркаваць, што конкурс будзе папраўдзе бяспройгрышным — яго ўдзельнікі не змарнуюць свой час у Заслаўі хаця б таму, што яны атрымаюць унікальную магчымасць паўдзельнічаць у майстар-класе маэстра Фінберга, што таксама запланаваны ў рамках фестывалю. Для маладых музыкантаў ён павінен стаць запамінальнай падзеяй.

Ілья СВІРЫН

8 студзеня будуць уручаны прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі дзеячам культуры і мастацтва. Пасля ўрачыстай цырымоніі адбудзецца, паводле традыцыі, святочны канцэрт. Чым ён парадуе нас сёлета? Якімі стануць яго адметнасці?

"Паштоўка" на Ражджаство

— У канцэрце, — паведаміла галоўны спецыяліст упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Іна Адамовіч, — возьмуць удзел лепшыя салісты і творчыя калектывы краіны. Сярод іх — народныя артысты рэспублікі Аляксандр Ціхановіч і Ядвіга Паплаўская, ансамбль "Камерата", Прэзідэнцкі аркестр Беларусі на чале з Віктарам Бабарыкіным, Дзяржаўная харавая капэла імя Рыгора Шырмы, оперныя салісты Уладзімір Громаў, Аляксандр Краснадубскі, Станіслаў Трыфанаў, вядомыя эстрадныя спевакі Наталля Тамела, Дзмітрый Качароўскі, гітарыстка Ірына Ігнацюк, лаўрэат міжнародных конкурсаў, піяніст Аляксандр Музыкантаў, ансамбль кафедры харэаграфіі БДУКіМ, навучэнцы сталічнага харэаграфічнага каледжа і многія іншыя.

— "Разыначкай" святочнага канцэрта, — распавяла рэжысёр Уладзіслава Арцюхоўская, на творчым рахунку якой — ажно тры Галоўныя ёлкі краіны, шматлікія святочныя канцэрты, у тым ліку на "Славянскім базары ў Віцебску", — стане прыём "жывой" каляднай паштоўкі. Мастачка Вольга Грыцаева зробіць на сцэне гэткі заснежаны калядны сад. У ім пастаянна мае знаходзіцца каля пяцідзесяці артыстаў. Яны будуць то "замірацъ", быццам выява на паштоўцы, то рухацца, змяняючы мізансцэны. Такога папраўдзе не было раней. Увогуле, разнастайных навінак ды прыдумак будзе куды больш, чым звычайна. Чаго вартыя, да прыкладу, хаця б сукенкі-трансформеры! Ці амаль сотня ліхтароў, што "запаляцца" ў час выступлення Анатоля Сіўко! Фіналам стане прэм'ера каляднай песні Алены Атрашкевіч на словы Людмілы Войнавай, калі на сцэну выйдуць усе дзве сотні ўдзельнікаў вечарыны. Цікавым будзе і пачатак канцэрта: Алена Ланская выступіць разам з тэатрам "Рукі" БДУКіМ, артысты якога будуць ствараць выявы літар і "складаць" з іх словы: "Надзея", "Вера", "Любоў" — як галоўныя пастулаты духоўнасці...

Н.Б.

Ключы ад Купалаўскага тэатра

У якасці навагодняга падарунка сталічны Будаўнічы трэст № 7 перадаў сімвалічныя ключы ад будынка Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы яго творчаму калектыву. Карэспандэнты "К" здолелі трапіць на аб'ект, які на працягу трох месяцаў уступае ў адказную стадыю падрыхтоўкі новага-старога Купалаўскага да прыёму гледачоў...

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Студзень у Брэсце заўсёды "гарачы"

8 — 12 студзеня ў Брэсце пройдзе XXV Міжнародны фестываль класічнай музыкі "Студзеньскія музычныя вечары". У адпаведнасці з юбілейнай лічбай, у ім, як плануюць арганізатары (а гэта Міністэрства культуры Беларусі, Брэсцкія абласны і гарадскі выканкамы, мясцовае аддзяленне Саюза музычных дзеячаў, абласное музтаварыства), возьмуць удзел прадстаўнікі 25-і краін свету.

Дырэктар фестывалю Лілія Батырава, займаючыся складаннем фестывальных праграм, практыкуе своеасаблівыя "гала-канцэрты", калі за вечар, змяняючы адно аднаго, выступаюць некалькі калектываў і знаных салістаў. Сярод іх — спявак Уладзіслаў П'яўко, піяніст Барыс Блох, скрыпачка Ліяна Ісакадзэ, трыа італьянскіх тэнараў, духавы квінтэт з Германіі, Львоўскі камерны аркестр "Акадэмія" ды іншыя. Весці канцэрты ўпершыню запрошаны народны артыст Расіі Святаслаў Бэлза, які летась справіў 70-годдзе і 40-годдзе працы на тэлебачанні. Шырока будуць прадстаўлены сёлета і беларускія музыканты.

— Брэсцкі дзяржаўны музычны каледж імя Рыгора Шырмы, — адзначае намеснік дырэктара Аліцыя Манькоўская, — неаднойчы ўдзельнічаў у фестывалі. Але звычайна гэта былі асобныя нумары некаторых нашых калектываў ды навучэнцаў. Сёлета ж дзвюхгадзінны "сольнік" нашай навучальнай установы з'яўляецца першым канцэртам форуму і праходзіць пад назвай "Уверцюра фестывалю". Выступяць усе чатыры аркестры каледжа, два хоры, наш ансамбль цымбалістаў "Лілея", ансамбль народнай песні "Купавушка", іншыя камерныя склады, а таксама пераможцы нядаўняга Міжнароднага конкурсу ў Эстоніі "Нарва запальвае зоркі". Фіналам стане Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Ф.Ліста, дзе з нашым студэнцкім калектывам будзе саліраваць народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў. Такая вечарына — не толькі вялікі гонар для нас, а яшчэ і прызнанне высокага прафесіяналізму нашых выхаванцаў і, зразумела, усяго педагагічнага складу каледжа.

Прымаюць удзел у свяце і прафесійныя мясцовыя калектывы: сімфанічны аркестр Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, камерны аркестр Брэсцкай абласной філармоніі, Брэсцкі гарадскі духавы аркестр. Запрошаны і вядучыя сталічныя склады: Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі, а таксама абодва Нацыянальныя акадэмічныя народныя — аркестр імя І.Жыновіча і хор імя Г.Цітовіча.

— Для юбілейнага фестывалю, — распавядае народны артыст Беларусі Міхаіл Казінец, — мы прапанавалі разнастайную па жанрах ды стылях праграму, дзе ёсць і творы беларускіх кампазітараў: "Святочная паэма" Яўгена Глебава, "Дзівосы Купалля" Уладзіміра Кур'яна. Падрыхтавалі і сюрпрыз: Аляксандр Крамко зрабіў для народнага аркестра пераладжэнні і апрацоўкі твораў Ігара Карнелюка, бо той, як вядома, — ураджэнец горада над Бугам. Атрымалася сюіта з яго музыкі да фільма "Майстар і Маргарыта"...

— Прыемна, — кажа народны артыст нашай краіны Аляксандр Анісімаў, які ўзначальвае "сімфанічны філарманічны", — што арганізатары фестывалю знаходзяць грошы для прыезду такіх буйных калектываў. Наш аркестр стаў ужо амаль пастаянным удзельнікам "Студзеньскіх музычных вечароў", у Брэсце нас заўсёды прымаюць вельмі цёпла…

Н.Б.

Установа адукацыі
"Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў"
аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу: *

- **дацэнт кафедры кінатэлеаператарства;**
- **загадчык кафедры графікі;**
- **загадчык кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання;**
- **загадчык кафедры графічнага дызайну;**
- **старшы выкладчык кафедры малюнка, жывапісу, скульптуры.**

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы. Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас:
220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 297-77-34.

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА ЛЮТЫ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2013 ГОДА!

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Калядны абрад "Калядныя Цары" ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна.

2013

СТУДЗЕНЬ

ПН		7	14	21	28
АЎТ	1	8	15	22	29
СР	2	9	16	23	30
ЧЦ	3	10	17	24	31
ПТ	4	11	18	25	
СБ	5	12	19	26	
НДЗ	6	13	20	27	

Многія праявы нематэрыяльнай спадчыны дайшлі да нас хіба ва ўспамінах старажылаў. У іх ліку — і зухаватая гульня "Жаніцьба Цярэшкі", што ладзілася ў вёсках Лепельшчыны. Тамтэйшыя бабулі ахвотна распавядалі пра яе членам экспедыцыі Студэнцкага этнаграфічнага таварыства. Падтрымліваць традыцыю ў актыўнай форме неяк не выпадала: век ужо не той! Пагатоў, гульня прызначалася выключна для нежанатых хлапцоў ды незамужніх дзяўчат з розных вёсак, спрыяючы іх знаёмству, — дыскатэк жа тады не было!

І сапраўдным цудам той агмень, што ўжо ледзь не патух, удалося раздзьмуць наноў. Моладзь знайшлася (няхай напачатку і немясцовая), і гадоў пяць таму абрад адрадзіўся — у сваім аўтэнтычным выглядзе. Цяпер ён ладзіцца ўжо рэгулярна, збіраючы на кожныя праваслаўныя Каляды як гасцей з розных куткоў Беларусі, так і маладых жыхароў тых самых вёсак.

Адметна, што своеасаблівым каталізатарам адраджэння гэтай традыцыі стала руплівіца агратурызму з Лепельшчыны Вольга Маханенка. І мэта, якую яна ставіць, — не толькі завабіць наведвальнікаў, але, перадусім, папулярызаваць "неадчувальныя" каштоўнасці свайго краю. Гэта акурат той выпадак, калі "шлюб" турызму і нематэрыяльнай спадчыны сапраўды гарманічны ды трывалы — нягледзячы на гарэзлівы характар самой гульні.

А ў эпіцэнтры каляднага перыяду — на Шчодры вечар — апрычоныя народныя святы віруюць у самых розных кутках Беларусі. І шмат дзе яны ладзяцца па сваім, унікальным сцэнарыі. Прыкладам, у Семежаве, знакамітым сваімі традыцыямі ткацтва, звыклую казу замяняюць знакамітыя ўжо "Калядныя Цары" ды іншыя персанажы, у вёсцы Рог Салігорскага раёна "Шчодрык" асабліва вызначаецца дзедам у берасцяной масцы. А вось у Навінах, што на Бярэзіншчыне, галоўнае каляднае свята ладзіцца ўжо па Вадохрышчы ды мае надзвычай спецыфічны сюжэт: Каляду, увасобленую ў выглядзе жытняга снапа, зацягваюць на дуб — у літаральным сэнсе слова! А вось на Клічаўшчыне захаваны нават дзіцячы абрад — "Куры".

Дзіцячы калядны абрад "Куры" ў Клічаўскім раёне.

ІКБ

Фота, пазначаныя на палосах календара абрэвіятурай ІКБ, прадастаўлены аддзелам навукова-метадычнага забеспячэння дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

ІКБ

Каляднае ігрышча "Жаніцьба Цярэшкі" ў Лепельскім раёне.

Фота Алены ГРОМАВАЙ

Абрад "Цягнуць Каляду на дуба" ў вёсцы Навіны Бярэзінскага раёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

ІКБ

Калядны абрад "Шчадрэц" у вёсцы Рог Салігорскага раёна.

Фота Алега БЕЛАВУСАВА

Стрэчанне на Грамніцы спраўляе аўтэнтычны калектыў "Палескія напевы" ў вёсцы Новае Палессе Лельчыцкага раёна.

Фота Алега БЕЛАВУСАВА

Песенны стыль выканання абрадавых і пазаабрадавых твораў захаваўся ў вёсцы Казлы Ельскага раёна.

Фота Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА

2013

ЛЮТЫ

ПН	4	11	18	25
АЎТ	5	12	19	26
СР	6	13	20	27
ЧЦ	7	14	21	28
ПТ	1	8	15	22
СБ	**2**	**9**	**16**	**23**
НДЗ	**3**	**10**	**17**	**24**

Пагалоска пра тое, што недзе сярод палескіх балот тоящца скарбы, ходзіць ужо даўно. І хаця іх радовішчы знайсці пакуль не ўдалося, яна, безумоўна, праўдзівая — прынамсі, калі казаць пра культурныя скарбы. Вось і маленькая вёсачка Казлы, што на Ельшчыне, дзе сёння пражывае ненашмат больш за два дзясяткі чалавек, спарадзіла ды захавала ўнікальную песенную традыцыю, якая мае статус нематэрыяльнай каштоўнасці.

Вёска Новае Палессе ў Лельчыцкім раёне раней мела "немілагучную" для кагосьці назву Каросцін, але нягледзячы на гэты "рэбрэндынг" здолела захаваць свой апрычоны культурны мікракліма. Ансамбль "Палескія напевы" ахвотна выканае старадаўнія песні для любой зацікаўленай публікі, выклікаючы захапленне як у простых слухачоў, так і ў музыказнаўцаў, што адзначылі надзвычайную для народнай культуры асаблівасць — валоданне самадзейнымі спявачкамі складанай тэхнікай імправізацыйнага вар'іравання тэмпу rubato, падуладнай не кожнаму салісту з кансерваторскай адукацыяй.

Зрэшты, не толькі Палессе багатае на адкрыцці. Даследчыкаў фальклору не менш уразіла і, скажам, песенная спадчына вёскі Паршына Горацкага раёна, носьбіты якой карыстаюцца самабытным мясцовым дыялектам.

А вось Гродна слаўны перадусім сваімі народнымі ўмельствамі, што нярэдка плаўна перацякаюць у аўтарскія практыкі. Сярод іх — і тэхніка падвойнага ткацтва, якая стала выяўленчым сродкам для самабытнай мастачкі Алены Шунейка — прадстаўніцы дынастыі ткачоў.

Фота Наталлі ПДЕЮТА
ІКБ

Габелены ў тэхніках падвойнага і пераборнага аднабаковага ткацтва стварае майстрыха Алена Шунейка з Гродна.

ІКБ

Традыцыя выканання вясельных і хрэсьбінных песень захвалася ў вёсцы Паршына Горацкага раёна.

Фота Алены ЦІШКЕВІЧ
ІКБ

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752. Паспяшайцеся на пошту!
Наш сайт: kimpress.by
Нашы старонкі ў сацыяльных сетках: facebook.com/kimpressby і twitter.com/kultura_by

Фота Алега БЕЛАВУСАВА

Абрадам "Чырачка" заклікаюць вясну ўдзельніцы фальклорна-этнаграфічнага гурта "Танежанка" вёскі Тонеж Лельчыцкага раёна. А яшчэ адной традыцыяй з'яўляецца выпечка "чырачкі" з цеста.

ІКБ

Традыцыю роспісу велікодных яек у гарадскім пасёлку Сапоцкін Гродзенскага раёна захавала і перадае вучням майстрыха Антаніна Юрчэня.

2013

САКАВІК

ПН		4	11	18	25
АЎТ		5	12	19	26
СР		6	13	20	27
ЧЦ		7	14	21	28
ПТ	1	**8**	15	22	29
СБ	**2**	**9**	**16**	**23**	**30**
НДЗ	**3**	**10**	**17**	**24**	**31**

31 сакавіка каталікі будуць святкаваць Уваскрэсенне Хрыстова. Вядома ж, без пісанак свята не абыдзецца. У мястэчку Сапоцкін, што непадалёк ад Аўгустоўскага канала, гэтыя яйкі яшчэ за дзедам-шведам сталі сапраўднымі творамі мастацтва.

Майстрыха Антаніна Юрчэня пераняла даўнюю традыцыю іх роспісу ад бацькоў і ахвотна перадае новым пакаленням. Сакрэтаў тут нямала. Прыкладам, для стварэння карункаў на чорным фоне выкарыстоўваецца адмысловы інструмент — "шпілька". У якасці матэрыялаў — натуральны пчаліны воск, а таксама фарбавальнік, зроблены паводле ўнікальнай тэхналогіі з мноства размаітых інгрэдыентаў: настою кары дуба, алешыны, альховых шышак і нават іржавага жалеза!

Але, напэўна, самы галоўны сакрэт заключаецца менавіта ў тым, як ствараць гэтыя дзівосныя малюнкі, выкарыстоўваючы замест палатна такі нетрывалы матэрыял, як звычайнае курынае яйка.

Гуканне вясны мае мноства народных "падвідаў", і адзін з самых самабытных — абрад пад назвай "Чырачка", што ладзіцца ў вёсцы Тонеж Лельчыцкага раёна ў апошні дзень Масленкі. Яго назва пайшла ад печыва ў выглядзе чырка-траскунка — птушачкі з падсямейства качак. А таксама — і аднайменнай песні.

Вельмі любяць спяваць і на хутары Збляны ў Лідскім раёне: ледзь не палова яго нешматлікіх насельнікаў уваходзіць у адметны фальклорны калектыў, які ўтварыўся сам сабою і толькі потым "займеў жылплошчу" ў найбліжэйшым ад хутара Доме культуры.

Разьбяр па дрэве Іван Супрунчык таксама выкарыстоўвае вельмі своеасаблівы — для скульптара — інструмент: звычайную сякеру. З яе дапамогай ён стварае ўражальны летапіс сваёй невялічкай вёскі Цярэблічы, схаванай у нетрах Столінскага раёна.

Аўтэнтычны калектыў з хутара Збляны Лідскага раёна.

Народны майстар, знакаміты разьбяр Іван Супрунчык і яго ўнікальны музей, створаны ў Цярэблічах Столінскага раёна. Зверху — кадр з дакументальнай стужкі "Давеку", прысвечанай творцу.

Фота maystra.livejournal.com

2013

КРАСАВІК

ПН	1	8	15	22	29
АЎТ	2	9	16	23	30
СР	3	10	17	24	
ЧЦ	4	11	18	25	
ПТ	5	12	19	26	
СБ	6	13	20	27	
НДЗ	7	14	21	28	

Фота Алены ЦІШКЕВІЧ

Песенны стыль танцавальнай лакальнай традыцыі міжрэчча Сожа і Проні захавалі ў вёсцы Галавенчыцы Чавускага раёна.

Фота Сяргея ВЫСКВАРКІ

Летась традыцыйны спеўны стыль вёскі Ямінск, збережаны ансамблем "Журавушка", атрымаў статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Фота Паліны БОГДАН

Адметная з'ява этнаспадчыны — тэхналогія пляцення паясоў вёскі Сакаўшчына Валожынскага раёна.

Кажуць, фальклорнымі традыцыямі Галавенчыцаў натхняўся ў свой час яшчэ сам Уладзімір Мулявін. Вёска ў Чавускім раёне знаходзіцца ў міжрэччы Сожа і Проні, і, на думку навукоўцаў, менавіта гэтая акалічнасць паўплывала на фарміраванне там вельмі своеасаблівага культурнага мікраклімату.

Безумоўна, ён характэрны і для Любаншчыны з яе ладным шэрагам аўтэнтычных фальклорных калектываў, пачэснае месца ў якім займае ансамбль "Журавушка" з вёскі Ямінск. Ды, на жаль, з намі ўжо няма яго стваральніка і шматгадовага кіраўніка Надзеі Новікавай: яна трагічна загінула год таму.

Свой мікрасусвет народнай культуры стварае і майстар народных інструментаў з Кругляншчыны Аляксандр Харкевіч. Адценняў яго творчасці надзвычай багата, і паўсюль ёсць свой сакрэт. Аказваецца, лыжкі з дубу гучаць зусім інакш, чым, да прыкладу, з бэзу, а дудку трэба вырабляць менавіта з крушыны — прычым, паводле старадаўняй тэхналогіі, дрэва павінна сохнуць не менш за два гады. Інакш — зусім не тое гучанне.

Вялікую працу па ўзнаўленні традыцыі падняпроўскай глінянай цацкі зрабіў народны майстар Вячаслаў Янкавенка з Крычаўшчыны. Цяпер свае веды ён перадае дзеткам у мясцовым Раённым доме рамёстваў.

А вось ў вёсцы Сакаўшчына Валожынскага раёна захавалі тэхналогію пляцення паясоў, якая праз пэўны час можа ўвайсці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Прынамсі, праца ў названым кірунку ўжо вядзецца.

Народны майстар Вячаслаў Янкавенка і яго жонка Людміла гадоў з пятнаццаць таму адрадзілі падняпроўскую гліняную цацку (яе ўзор — справа). Цяпер жа вопыт перадаецца маленькім вучням у Крычаўскім раёне, дзе майстар кіруе народным дзіцячым калектывам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Свістулька".

Тэхналогію вырабу ўнікальных беларускіх драўляных музычных інструментаў збераглі майстры Кругляншчыны пад кіраўніцтвам Аляксандра Харкевіча (першы злева).

Фота Алены ЦІШКЕВІЧ

2013

МАЙ

ПН		6	13	20	27
АЎТ		7	14	21	28
СР	1	8	15	22	29
ЧЦ	2	9	16	23	30
ПТ	3	10	17	24	31
СБ	4	11	18	25	
НДЗ	5	12	19	26	

Фота Тацяны МАРМЫШ
ІКБ

Фота Алега БЕЛАВУСАВА
ІКБ

Абрад "Тураўскі карагод" на Юр'е адзначаюць у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна.

ІКБ

Фота Тацяны МАРМЫШ
ІКБ

Традыцыя пакланення каменным крыжам "Каменныя дзевачкі" паходзіць з вёсак Данілевічы і Баравое Лельчыцкага раёна.

Ладную частку Івацэвіцкага раёна займаюць непралазныя гаі, азёры ды балоты — тыя мясціны, дзе прырода захоўвае сваю першасную красу. Акурат сярод іх і затаілася вёска Аброва, гісторыя якой сягае яшчэ ў часы Вітаўта.

Жыццё ў гэтым ціхім кутку было даволі спакойным, але ж раптам здарылася сапраўдная бяда: у 20-я гады мінулага стагоддзя ад невядомай хваробы адзін за другім сталі паміраць дзеткі... Вяскоўцы знайшлі панацэю. У адну ноч аброўскія жанчыны сабраліся разам ды выткалі ручнік, мужчыны ж зрабілі ківот для іконы Божай Маці. Змясціўшы туды абгорнуты ручніком абраз, людзі абышлі ў Светлы Чацвер працэсіяй усю вёску. І бяда супынілася.

Адсюль і пайшла традыцыя пад назвай "Намскі (што значыць: "наш") Вялікдзень", якая жыве ўжо амаль стагоддзе.

На май прыпадае і Юр'е. У розных рэгіёнах Беларусі яно праходзіць па-рознаму, і параўнаўшы тыя абрады ды гульні, якія ладзяцца, скажам, у палескай вёсцы Пагост, што на Жыткавіччыне, і панямонскім Ахонаве ў Дзятлаўскім раёне, можна яшчэ раз здзівіцца багаццю ды самабытнай вынаходлівасці народнай культуры.

А, бадай, самае арыгінальнае свята велікоднага перыяду праходзіць штогод у некалькіх вёсках Лельчыцкага раёна. Пад інтрыгуючай назвай "Каменныя дзевачкі" тоіцца абрад шанавання камянёў, якія маюць антрапаморфныя рысы.

Фота Паўла КАЛАДЗЕЙЧЫКА
ІКБ

Фота Паўла КАЛАДЗЕЙЧЫКА
ІКБ

Абрад "Намскі Вялікдзень" адзначаюць у вёсцы Аброва Івацэвіцкага раёна.

ІКБ

Фота Андрэя ЛЯНКЕВІЧА

Юр'еўскі абрад у вёсцы Ахонава Дзятлаўскага раёна.

ІКБ

Фота Алега БЕЛАВУСАВА
ІКБ

Абрад "Ваджэнне і пахаванне Стралы" шануюць ў вёсцы Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна.

2013

ЧЭРВЕНЬ

ПН	3	10	17	24
АЎТ	4	11	18	25
СР	5	12	19	26
ЧЦ	6	13	20	27
ПТ	7	14	21	28
СБ	1 8	15	22	29
НДЗ	2 9	16	23	30

Фота Кастуся АНТАНОВІЧА

Абрад "Русалле" спраўляюць у вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна.

Фота Юрыя ІВАШКЕВІЧА

У вёсцы Неглюбка Веткаўскага раёна захавалі не толькі аўтэнтычную спеўную манеру, але і ўнікальнае ткацтва.

Веткаўскі край знакаміты не толькі як колішняя "сталіца старавераў", але і дзякуючы архаічным праявам народнай культуры — такім, як традыцыі ткацтва з вёскі Неглюбка, якія жывыя і сёння. А таксама — унікальнымі святамі.

Дзень Узнясення Хрыстовага ў вёсцы Казацкія Балсуны сведчыць пра пераход ад вясны да паўнавартаснага лета. Ён звязаны таксама і з прыроднымі з'явамі: як вядома, менавіта ў гэты перыяд адбываюцца першыя сур'ёзныя навальніцы, і сяляне імкнуліся засцерагчыся ад перуноў усімі даступнымі сродкамі. Так з'явіўся ўнікальны абрад "Ваджэнне і пахаванне Стралы".

У іншых кутках Палесся ў чэрвені ладзяць свае самабытныя святы. Скажам, Русалле ў вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна. Па традыцыі, штогод русалку выбіраюць з ліку незамужніх дзяўчын вёскі.

У нечым падобны абрад адбываецца і ў некаторых вёсках Піншчыны, але ж ён мае назву "Ваджэнне куста". Не ведаючы мясцовых гаворак, нават цяжка даўмецца, што пад "кустом" насамрэч маецца на ўвазе менавіта прыгажуня — увасабленне вітальнасці і чысціні.

Фота Андрэя ЛЯНКЕВІЧА

Абрад "Ваджэнне куста" жыве ў вёсках Сташаны і Парэчча Пінскага раёна.

2013

ЛІПЕНЬ

ПН	1	8	15	22	29
АЎТ	2	9	16	23	30
СР	3	10	17	24	31
ЧЦ	4	11	18	25	
ПТ	5	12	19	26	
СБ	6	13	20	27	
НДЗ	7	14	21	28	

Купальскі абрад у вёсцы Астраўляны Гарадоцкага раёна.
Фота Васіля МАЛАШЭНКАВА

Святыя крыніцы, удосталь раскіданыя па ўсёй Беларусі, хтосьці лічыць хрысціянскім пераасэнсаваннем архаічных язычніцкіх вераванняў, а хтосьці — праявай народнай душы, не схільнай праводзіць мяжу паміж творчасцю ды рэлігіяй.

Старажылы з вёскі Наркі, што на Чэрыкаўшчыне, распавядаюць, як некалі, вельмі даўно, з-пад зямлі раптам хлынулі струмяні вады. І так моцна, што ажно было чуваць, як камяні бразгаталі. Людзі адразу ж спалохаліся: можа, гэта новы Патоп пачаўся? І паколькі акурат надоечы было свята апосталаў Пятра і Паўла, сталі прасіць нябесных апекуноў аб заступніцтве. Малітвы былі пачуты, і вада ў крынічцы супакоілася. Да таго ж, як кажуць, і пажары ўжо больш не турбавалі вяскоўцаў.

З таго часу і бярэ свае вытокі абрад, які мясцовыя людзі называюць "Бразгун". Нягледзячы на ўсе гістарычныя пературбацыі, ён штогод ладзіцца 12 — 13 ліпеня, уключаючы мноства складнікаў — ад малебна да гутаркі. Некаторыя з іх маюць прыватны характар і разлічаны толькі на вясковую супольнасць, але ж тыя-сія збіраюць ля крынічкі людзей з усіх ваколіц ды нешматлікіх пакуль турыстаў.

На ліпень прыпадае адзін з самых старажытных і чароўных абрадаў — Купалле, з якім так шмат звязана ў нацыянальнай міфалогіі. Ды і ў свядомасці сучаснікаў ён выклікае, бадай, больш за ўсё асацыяцый — ад вянкоў са свечкамі на паверхні вады да пошукаў чароўнай папараць-кветкі...

Наогул, як адзначаюць спецыялісты, паняційныя рамкі нематэрыяльнай культурнай спадчыны — даволі шырокія, і таму часам мы нават не здагадваемся, што перад намі — яе элемент. Напрыклад, знакаміты Будслаўскі фэст. Тысячы пілігрымаў з усіх куткоў Беларусі вось ужо два стагоддзі запар штогод рушаць пешкі да найбольш шанаванага ў нашым краі абраза Маці Божай, і ў ліпеньскую ноч ля велічнага барочнага касцёла запальваецца мора свечак. Між іншым, традыцыя развіваецца: па ініцыятыве Яго Эксцэленцыі Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча з нядаўняй пары практыкуюцца і паломніцтвы... на веласіпедах.

Фота Алены ЦІШКЕВІЧ

Фота Алены ЦІШКЕВІЧ

Абрад "Бразгун" і яго складнік — шанаванне іконы святых Пятра і Паўла — у вёсцы Наркі Чэрыкаўскага раёна.

Фота catholic.by

Будслаўскі фэст у Мядзельскім раёне можа праз пэўны час атрымаць статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Фота Сяргея ВЫСКВАРКІ

Удзельніцы калектыву "Павалякі" Любанскага раёна пад час Зажынак. Песенны стыль гэтага гурта, таксама, як і "Журавушкі" ды "Глыбокіх крыніц", атрымаў статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны.

ІКБ

2013

ЖНІВЕНЬ

ПН		5	12	19	26
АЎТ		6	13	20	27
СР		7	14	21	28
ЧЦ	1	8	15	22	29
ПТ	2	9	16	23	30
СБ	3	10	17	24	31
НДЗ	4	11	18	25	

Фота Святланы ЖЫГУНОВАЙ

Камень-дажджавік з вёскі Крамянец Лагойскага раёна шануецца мясцовымі жыхарамі.



ІКБ

Шанаванне "Блакітнай крыніцы" непадалёк ад вёскі Клінцы Слаўгарадскага раёна.

ІКБ

Простае двухнітовае ткацтва пашырана ў Ваўкавыскім раёне.

У самы бліжэйшы час Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей можа папоўніцца яшчэ на пяць пазіцый: адпаведныя дакументы ўжо падрыхтаваны і неўзабаве будуць разгледжаны Навукова-метадычнай радай пры Міністэрстве культуры краіны. У ліку кандыдатаў — і дзве шыкоўныя кулінарныя традыцыі Глыбоччыны.

Назва адной з іх можа ўвесці ў аблуду. Але ж гутарка, вядома, не пра якісьці адпаведнік шашлыку. "Масляны баран" таму і называецца масляным, што робіцца менавіта з гэтай стравы. Сям'я Струй з вёскі Мацюкова здавён валодае рэцэптурай вырабу хатняга масла, і апошняе перш чым трапіць на святочны стол, па традыцыі, набывае форму баранчыка. Такую скульптуру нават есці шкада!..

А вось у вёсцы Дзеркаўшчына гасцей могуць пачаставаць квасным жытнім хлебам, выпечаным паводле ўласнай тэхналогіі, што амаль не зведала змен за мінулыя стагоддзі.

Што адметна, абодва гэтыя рэцэпты не з'яўляюцца сакрэтнымі: носьбіты традыцый ахвотна дзеляцца імі з усімі ахвотнымі. Будзем спадзявацца, неўзабаве пакаштуем таго хлеба з маслам у якой мясцовай кавярні або аграсядзібе.

А ў Ваўкавыскім раёне па-ранейшаму жывы ці не самы архаічны спосаб ткацтва — двухнітовы.

Любаншчына лічыцца не толькі сапраўдным аазісам аўтэнтычнага фальклору, але і своеасаблівай лабараторыяй пошуку спосабаў яго бытавання ў сучасным свеце ды натуральным асяроддзі. Таму не дзіва, што песенныя традыцыі тамтэйшых вёсак Обчын, Ямінск і Закальное аднымі з першых набылі статус элементаў нематэрыяльнай спадчыны. Не выпадае здзіўляцца і таму, што немаладыя ўжо паводле веку спявачкі паспяхова выступаюць не толькі ў раёне, зрываючы шчырыя апладысменты нават на фэстах сучаснай музыкі. Адзначым і самую важную асаблівасць: ініцыятыва па "прасоўванні" сваёй культуры перадусім зыходзіць менавіта "з месца" — або, дакладней, ад муніцыпальных улад.

Непадалёк ад вёскі Клінцы ў Слаўгарадскім раёне ёсць месца, якое ўсе тутэйшыя ведаюць пад назвай "Блакітная крыніца". 14 жніўня, на Мядовы Спас, людзі сцякаюцца туды на свята. Прычым сярод іх — не толькі жыхары бліжэйшых вёсак, але нават і госці з суседніх Браншчыны ды Чарнігаўшчыны. Зрэшты, крыніца — і сапраўды незвычайная: і зімой, і летам вада ў ёй мае пастаянную тэмпературу +8.

Урэшце, адзін з самых арыгінальных кандыдатаў на ўключэнне ў Дзяржспіс гісторыка-культурных каштоўнасцей — абрад выкліку дажджу. Многія думаюць, што ён практыкуецца толькі нейкімі шаманамі, але ж і ў Лагойскім раёне ёсць такі адмысловы камень, які, кажуць, здольны дапамагчы ў гэтай карыснай для сельскай гаспадаркі справе.

ІКБ

ІКБ

Адметныя кулінарныя традыцыі захаваны ў вёсках Мацюкова і Дзеркаўшчына Глыбоцкага раёна. Неўзабаве мясцовы звычай рабіць маслянога баранчыка, а таксама адметная тэхналогія выпечкі хлеба маюць папоўніць Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

ІКБ

ІКБ

2013

ВЕРАСЕНЬ

ПН	2	9	16	23	30
АЎТ	3	10	17	24	
СР	4	11	18	25	
ЧЦ	5	12	19	26	
ПТ	6	13	20	27	
СБ	7	14	21	28	
НДЗ	1 8	15	22	29	

Фота Галіны ГАЛІЧУК

Ганчарным майстэрствам славілася вёска Гарадная ў Столінскім раёне, дзе праводзіцца і адпаведны пленэр.

Фота Максіма ЦЯЦЕРЫНА

Адразу дзве традыцыі захоўваюцца ў Дрыбінскім раёне. Гэта — тэхналогія пляцення лапцей і творчасць майстроў-шапавалаў.

Фота Ільі СВІРЫНА

Фота Вольгі СЕМЧАНКА

Тэхналогія ганчарных вырабаў захоўваецца ў Бабруйскім раёне. На фота злева — адзін з майстроў Юрый Боўда.

Яшчэ зусім нядаўна Дрыбіншчына наўрад ці выклікала ў каго нейкія ўстойлівыя асацыяцыі, але сёння сітуацыя ўжо ладна выправілася. Як выявілася, у наймаладзейшым беларускім раёне захавалася даўняя традыцыя шапавальства, якая нават спарадзіла сваю мову — катрушніцкі лемезень. Стараннямі шмат у чым мясцовых работнікаў культуры яна стала вядомай ва ўсёй краіне і прэтэндуе на ўключэнне ў рэпрэзентатыўны Спіс UNESCO. Варта адзначыць, што такая ўвага істотна паспрыяла росту прэстыжу гэтага цяжкага рамяства, прызначанага зусім не для беларучак.

У той самы час, Дрыбіншчына славіцца і арыгінальнай тэхналогіяй пляцення лапцей, якая таксама мае статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Таму і не дзіва, што гарадок стаў сталіцай уласнага кірмашу рамёстваў "Дрыбінскія таржкі" — балазе такая завядзёнка некалі і сапраўды існавала ў гэтых мясцінах.

Вёска Гарадная, што на Століншчыне, таксама здавён мае свой "брэнд": ужо не першае стагоддзе яна славіцца сваімі ганчарамі. Не так даўно такі від "саматужнай вытворчасці" зусім не вітаўся ўладамі, але ж у незалежнай Беларусі стаўленне да яго, вядома ж, кардынальна змянілася. Штогод там ладзіцца Міжнародны пленэр ганчароў, які збірае майстроў з добрага тузіна краін.

Між тым, на званне ганчарскай сталіцы Беларусі прэтэндуюць і іншыя гарады: да прыкладу, Бабруйск з унікальнай тэхналогіяй падобных вырабаў, альбо Івянец, дзе рэгулярна ладзіцца яшчэ адзін ганчарскі фэст — "Гліняны звон".

Фота Юрыя ІВАНОВА

2013

КАСТРЫЧНІК

ПН		7	14	21	28
АЎТ	1	8	15	22	29
СР	2	9	16	23	30
ЧЦ	3	10	17	24	31
ПТ	4	11	18	25	
СБ	5	12	19	26	
НДЗ	6	13	20	27	

Фота Юрыя ІВАНОВА

Экспанаты з рукачыннага музея разьбяра Мікалая Тарасюка "Успаміны Бацькаўшчыны". Перад Новым, 2013-м годам інтэлігенцыя Брэстчыны ўзнагародзіла майстра ордэнам "За вернасць Бацькаўшчыне" аўтарства мастака-ювеліра Мікалая Кузьміча.

ІКБ

Традыцыйная тэхналогія закладнога ткацтва ручнікоў захавана ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна.

Разбяр з Пружаншчыны Мікалай Тарасюк робіць не проста драўляныя скульптуркі — ён стварае свой уласны "народ", свой невялічкі сусвет, які прыходзіць наўзамен зніштожанаму ўрбанізацыяй патрыярхальнаму мікраклімату яго роднай вёскі Стойлы. Характэрныя (або характарныя) сцэнкі з народнага побыту альбо аўтарскае бачанне глабальнай праблематыкі прасякнуты пульсацыяй жывога пачуцця — у тым ліку, і пачуцця гонару за сялянскі люд.

Некалі закладное ткацтва было даволі распаўсюджана на Міншчыне, але ж ужо больш як стагоддзе таму гэтая традыцыя пачала забывацца. Тым не менш, вёска Семежава здолела яе захаваць і данесці да нашых дзён.

"Жанілі" на Беларусі не толькі Цярэшку, але і комін: абрад з такой дзіўнай назвай і пагэтуль захаваўся на Палессі, у вёсцы Пагост. Ён адбываўся ў Дзень святога Сымона Стоўпніка — 14 верасня, сімвалізуючы надыход восені, той пары, калі без коміну ў вёсцы не пражывеш. З нагоды "вяселля" комін не толькі беляць ды ўпрыгожваюць, але нават і "кормяць" прысмакамі!

Рэканструкцыя абраду "Жаніцьба коміна", ажыццёўленая ў гомельскім філіяле Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава.

Абрад "Котчынская кадрыля" з вёскі Котчына Мастоўскага раёна.

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752. Паспяшайцеся на пошту!
Наш сайт: kimpress.by
Нашы старонкі ў сацыяльных сетках: facebook.com/kimpressby і twitter.com/kultura_by

Фота Вольгі ШЛАВЯНЕЦ.

Творчасць майстра па вырабе музычных інструментаў Мар'яна Скрамблевіча з аграгарадка "Адэльск" Гродзенскага раёна займае сваё месца ў Спісе элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Традыцыйная тэхналогія ткацтва падвойных дываноў захавана ў вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна.

2013

ЛІСТАПАД

ПН		4	11	18	25
АЎТ		5	12	19	26
СР		6	13	20	27
ЧЦ		7	14	21	28
ПТ	1	8	15	22	29
СБ	2	9	16	23	30
НДЗ	3	10	17	24	

Сярод элементаў (словы "аб'ект" або "помнік" тут не надта пасуюць) нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны — не толькі народныя абрады ды ўмельствы, але і аўтарскія творчыя практыкі, настоеныя на народных традыцыях. У мінулым, 2012 годзе такі пачэсны статус набыла творчасць Мар'яна Скрамблевіча. Майстар, які размяняў ужо восьмы дзясятак, з самага дзяцінства цікавіўся народнымі музычнымі інструментамі: дудамі, трашчоткамі, скрыпкамі... І яму заўсёды мала было іх асвоіць — карцела прымусіць загучаць яшчэ больш сакавіта ды мілагучна. Адным з такіх "ноу-хау" сталі акарыны. Мар'ян Скрамблевіч быў ці не першым, хто наважыўся зрабіць гэты інструмент не з гліны, а з дрэва. І калі новастворaны інструмент упершыню "падаў голас", стала адразу зразумела: эксперымент быў удалым.

У родным мястэчку Адэльск, што непадалёк ад Гродна, майстар стварыў уласны Музей народных інструментаў, які працуе пры мясцовым Доме культуры. Наведваюцца да яго і вучні — Мар'ян Скрамблевіч ахвотна дзеліцца сакрэтамі майстэрства з цікаўнымі мясцовымі падлеткамі. Таму ёсць падставы меркаваць, што багацце, набытае цягам ягонага жыцця, не знішчыць няўмольны час...

Традыцыі падвойнага ткацтва вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна таксама захоўваюцца менавіта дзякуючы музею, знакамітаму далёка за межамі таго краю. Там працуе і ткацкі пакой, дзе мясцовая малеча вучыцца працаваць на аўтэнтычных кроснах.

Брак арыгінальных музеяў моцна даецца ў знакі для развіцця турызму, ды, на шчасце, сітуацыя спакваля выпраўляецца. Вось і ў вёсцы Стрэнькі, што на Рагачоўшчыне, не так даўно адкрыўся Музей беларускай лялькі на базе Цэнтра рамёстваў. Адпаведна, традыцыі стварэння гэтых абярэжных лялек для дзяцей і дарослых атрымалі новыя магчымасці для захавання ды развіцця.

Майстар лозапляцення Генадзь Унукаў таксама перадае сваё ўмельства дзеткам — ён вядзе гурток у Маладзечанскім палацы культуры. І менавіта наяўнасць вучняў засцерагае нематэрыяльную спадчыну ад знікнення.

Ансамбль "Завіца" з вёскі Падзялавічы Ганцавіцкага раёна складаецца пераважна з кабет ужо пажылых, але ж, паводле іх слоў, дзеці ды ўнукі таксама цягнуцца да народных спеваў.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Стрэнькаўская лялька з Рагачоўскага раёна, традыцыі якой захоўваюцца ў РДР.

Фота Міхаіла МАРЖЭЎСКАГА

Майстар па лозапляценні Генадзь Унукаў з Маладзечна і яго вырабы (на фота ўнізе).

Аўтэнтычны фальклорны гурт "Завіца" з Ганцавіцкага раёна.

Фота Міхаіла МАРЖЭЎСКАГА

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752. Паспяшайцеся на пошту!
Наш сайт: kimpress.by
Нашы старонкі ў сацыяльных сетках: facebook.com/kimpressby і twitter.com/kultura_by

Абрад "Варварынская свяча", які захаваўся ў вёсцы Басценавічы Мсціслаўскага раёна.

У вёсцы Губарэвічы Хойніцкага раёна шануюць дрэва, дзе, як мяркуецца, праявіўся нерукачынны вобраз Багародзіцы.

2013

СНЕЖАНЬ

ПН	2	9	16	23	30
АЎТ	3	10	17	24	31
СР	4	11	18	**25**	
ЧЦ	5	12	19	26	
ПТ	6	13	20	27	
СБ	7	14	21	28	
НДЗ	1 8	15	22	29	

Наталля Дамянікава з Магілёва робіць сапраўдныя цуды з саломкі.

Традыцыйныя стравы Магілёўшчыны.

Фальклорны гурт "Спадчына" з Глыбоцкага раёна з мясцін ля знакамітага возера Шо.

У вёсцы Басценавічы, што на Мсціслаўшчыне, асабліва ўшаноўваюць раннехрысціянскую вялікапакутніцу Варвару. Штогод на яе свята, якое прыпадае на 17 снежня, адбываецца перадача з дома ў дом вялікай васковай свечкі, для якой спецыяльна шыюцца адмысловыя апранахі. Здавалася б, працэдура простая, але... Як заўсёды ў народнай культуры, яна пераўтвараецца ў шматпрыступкавую комплексную дзею, што спалучае сакральны аспект і побытавы: без урачыстай вячэры, вядома ж, не абыходзіцца. Цікава і тое, што абрад распачынаецца менавіта ўначы.

Шмат хто чуў, што, паводле адной з версій, геаграфічны цэнтр Еўропы знаходзіцца менавіта на беразе маляўнічага возера Шо на Глыбоччыне. Але мала хто ведае, што непадалёк ад яго, у вёсцы Івесь, даўно існуе калектыў пад назвай "Спадчына" — і назвай, у гэтым выпадку, зусім не галаслоўнай, бо на канцэртах гучаць не сцэнічныя апрацоўкі, а менавіта тыя песні, якія здавён выконваліся ў тых краях.

Магілёўская майстрыха Наталля Дамянікава здатная вырабляць сапраўдныя цуды з такога, здавалася б, крохкага ды капрызлівага матэрыялу, як саломка. У ейных руках ён выглядае, не раўнуючы, бы сапраўднае золата! Дасягнуць такога выніку асабліва складана, калі ўлічыць, што некаторыя з яе лялек зусім маленькія: не больш за дзесяць сантыметраў у вышыню! Адметна, што творца ахвотна дзеліцца сваім умельствам з іншымі: яна працуе метадыстам Абласнога цэнтра народнай творчасці і ў гэтай якасці пастаянна «загартоўвае» будучых кіраўнікоў гурткоў саломкапляцення.

Шаноўныя сябры!
Мы ўпэўнены, што і ў вашых вёсцы, мястэчку ці горадзе захаваны непаўторныя абрад альбо традыцыя, рамяство альбо тэхналогія! Мяркуем, яму таксама ў будучым знойдзецца месца і на палосах газеты "Культура". Пішыце нам, распавядайце пра свае адметнасці!
220013, г. Мінск, пр-т. Незалежнасці, д. 77
А ў гэты фрагмент газетнай плошчы прапануем змясціць фота вашага аўтэнтычнага калектыву, абраду ці традыцыі!

Пасляслоўе да каляндара "К"-2013

Сёлета сваё дзесяцігоддзе адзначыць Канвенцыя UNESCO аб захаванні нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Дакумент папраўдзе эпахальны: менавіта ён сфармуляваў стаўленне сусветнай супольнасці да тых культурных каштоўнасцей, якія самі па сабе неспасціжныя з дапамогай органаў пачуццяў, і, мабыць, менавіта таму пра іх існаванне многія раней нават і не задумваліся.
Англійскае слова “intangible” мае мноства слоўнікавых дэфініцый, і “нематэрыяльны” — гэта толькі адна з іх. Далей праз коску, нібыта ўдакладняючы, ідуць словы “неадчувальны”, “няўлоўны” і нават “неспасціжны”. Безумоўна, такі сінанімічны шэраг моцна інтрыгуе, ды, у той самы час, і дадае клопатаў. Асабліва калі гутарка вядзецца пра спадчыну. Прынцып “Не нашкодзь!” тут асабліва важны — і найбольш складаны для выканання.
Канвенцыя прапануе некалькі асноўных алгарытмаў дзеяння. Адзін з іх — стварэнне таго комплексу ўмоў (у тым ліку сацыяльных ды эканамічных), якія спрыяюць натуральнай жыццяздольнасці абраду. Другі — папулярызацыя народнай спадчыны, дзякуючы чаму элементы апошняй становяцца больш каштоўнымі для саміх носьбітаў. Але ж рэальнае ўвасабленне гэтых прынцыпаў заўсёды спараджае мноства “ўзбочных” пытанняў.

Генетычны код матэрыялізацыі "нематэрыяльнай..."

Рух “знізу”

Зусім нядаўна здарылася і яшчэ адна адметная падзея: у снежні мінулага года Беларусь упершыню трымала справаздачу па выніках імплементацыі Канвенцыі на пасяджэнні Міжурадавага камітэта UNESCO ў Парыжы. Як вядома, наша краіна ратыфікавала гэты дакумент адной з першых у рэгіёне, а справаздачы ладзяцца акурат раз на шэсць гадоў.

Па словах прадстаўніка Беларусі ў Міжурадавым камітэце Алы Сташкевіч, замежныя эксперты ацанілі зробленае нашай краінай станоўча: дзейнасць па захаванні “неадчувальнай спадчыны” ўжо ад самага пачатку мае сістэмны характар. Усё больш і больш яе элементаў набываюць афіцыйны статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, праводзіцца рэгулярны маніторынг іх стану, у рэгіёнах ладзяцца семінары ды трэнінгі, а неўзабаве з’явіцца і Нацыянальны інвентар, які будзе змяшчаць не менш за сто элементаў. Пры фінансавай падтрымцы Фонду нематэрыяльнай спадчыны UNESCO яго стварэннем займаецца аддзел па навукова-метадычным забеспячэнні дзейнасці па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Інстытута культуры Беларусі, які ўзначальвае Ала Сташкевіч. А не так даўно ў Сеціве ўжо з’явіўся (няхай сабе пакуль у бета-версіі) партал “Жывая спадчына Беларусі”.

— І самае важнае, што гэты рух у нас ідзе менавіта “знізу”, ініцыятыва зыходзіць у значнай ступені менавіта ад саміх носьбітаў элементаў спадчыны, — дадае Ала Сташкевіч.

Менавіта таму далёка не кожны пункт інвентара будзе прадубліраваны на сайце: у іх ліку ёсць і тыя праявы спадчыны, што маюць сакральны сэнс для яе носьбітаў, і апошнія не вельмі ахвотна гатовы дзяліцца ім з усімі цікаўнымі. Але агулам інтэрнэт-праект, безумоўна, разлічаны акурат на папулярызацыю лакальных народных набыткаў.

І сапраўды, калі казаць пра рэальныя вынікі дзейнасці Канвенцыі на Беларусі, ніяк не абмінеш увагай інфармацыйны аспект. Яшчэ зусім нядаўна мала хто ў нас ведаў пра існаванне нематэрыяльнай спадчыны як такой — не кажучы ўжо пра канкрэтныя яе ўзоры ў родных пенатах: прыкладам, тыя ж “Калядныя Цары” ў Семежаве. Але ж сам факт уключэння абраду ў Спіс UNESCO настолькі моцна прапіярыў старадаўнюю дзею, што... гэта ўжо нават выклікае пэўную насцярожанасць.

— Праводзячы рэгулярны маніторынг “Калядных Цароў”, мы заўважылі, што, з аднаго боку, цікавасць да абраду стымулюе саміх яго носьбітаў, выклікае ў іх заканамернае пачуццё гонару, — распавядае Ала Сташкевіч, — але, з іншага, мы назіраем і адваротную тэндэнцыю: некаторыя мясцовыя жыхары ўспрымаюць такую ўвагу ўжо даволі насцярожана. Тым больш, турысты і прадстаўнікі СМІ не заўсёды вылучаюцца этычнасцю ды часам не хочуць усведамляць тую мяжу, што аддзяляе абрад ад шоу-праграмы...

На думку спецыяліста, праблему можа вырашыць выпрацоўка своеасаблівых “кодэксаў паводзін”, абавязковых для выканання ўсімі гасцямі ды індывідуальных для кожнага з элементаў нематэрыяльнай спадчыны. Прычым устанаўліваць гэтыя рамкі і вызначаць межы дазволенага ў дадзеным выпадку маюць права выключна самі носьбіты традыцыі.

Ці патрэбны рэжысёр для абраду?

Як адзначыла Ала Сташкевіч, нярэдка гэтыя паўнамоцтвы імкнуцца ўзяць на сябе мясцовыя ўстановы культуры. І тут мы зноў маем палку з двума канцамі. З аднаго боку, у справе захавання народных традыцый Беларусь мае больш выгодныя ўмовы за многія іншыя краіны: створаная за савецкім часам сетка ўстаноў культуры ў нас па-ранейшаму спраўна працуе ды спакаваля ўдасканальваецца і вонкава, і па змесце. Натуральна, носьбіты традыцый могуць — і павінны — разлічваць на іх падтрымку. Толькі вось... Пытанне ў тым, якой гэтая падтрымка павінна быць.

— Дапамагаць, каардынаваць, прапагандаваць, аказваць матэрыяльную падтрымку, скажам, у справе вырабу тых жа строяў, вось тое, чым у дадзеным выпадку павінны займацца рэгіянальныя ўстановы культуры, — кажа Ала Сташкевіч. — Але пры гэтым — пакідаць вырашальнае слова за самімі прадстаўнікамі супольнасці. На жаль, даводзіцца канстатаваць, што часам работнікі культуры надзяляюць сябе правам “рэжысіраваць” народныя абрады, кіраваць самімі носьбітамі традыцый, вучыць іх, як і што трэба рабіць. Прыкладам, у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна, дзе ладзіцца слынны абрад “Юр’е”, летась давялося назіраць сапраўдныя непаразуменні на гэты конт паміж работнікамі культуры і самой супольнасцю. Ды і тыя ж “Цары” зусім не ўзбагацілі сцэнічныя элементы ў выглядзе эстрадных спеваў, якія мы бачылі мінулым разам. Уласна, гэта я да таго, што жаданне нешта палепшыць у дадзеным выпадку не заўсёды прыносіць добры плён...

Праблема статуса

Але тут немінуча паўстае пытанне: а хто ж тады мае права прымаць рашэнні? Хто яны, гэтыя самыя носьбіты? На практыцы такая катэгорыя часам выглядае досыць размытай, а юрыдычна абгрунтаванага паняцця не існуе наогул. І менавіта таму Ала Сташкевіч ды іншыя спецыялісты ў сферы аховы спадчыны лічаць мэтазгодным надаць яе носьбітам канкрэтны статус — прыкладам, узяўшы за ўзор сістэму народных ды ўзорных калектываў, кожны з якіх сёння атрымлівае пэўную дзяржпадтрымку. Цяжка сказаць, ці прымяняльны такі падыход для ўсіх праяў нематэрыяльнай спадчыны: надта яны размаітыя! Але ж у некаторых — спрацуе дакладна, як, напрыклад, у выпадку са знакамітым інсітным скульптарам Мікалаем Тарасюком.

Тым больш, праблема статуса рана ці позна можа ўзнікнуць і ў зусім іншай плоскасці — аўтарскага права. У нядаўнія часы бытавала прымаўка: “Усё вакол — народнае, усё вакол — маё”. Але, як кажуць спецыялісты, адсутнасць канкрэтнага аўтара не дазваляе кожнаму ахвотнаму “прысабечваць” тыя або іншыя элементы спадчыны ці выкарыстоўваць іх на свой капыл. На Беларусі падобных прыкладаў пакуль не было, затое ў свеце іх — удосталь. Закон тут вядомы: чым большую вядомасць набывае той або іншы “брэнд”, тым больш у яго з’яўляецца падробак “з Малой Арнаўцкай”. І справа нават не толькі ў эканамічным аспекце, але перадусім у тым, што ў моры фальшывак спакваля размываецца аўтэнтыка.

■■■

Зірнуўшы на карту тых элементаў нематэрыяльнай спадчыны, што ўжо маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці альбо з’яўляюцца першымі на яго прэтэндэнтамі, можна заўважыць дзіўную акалічнасць: большасць з іх месціцца менавіта ў тых рэгіёнах, якія на сёння не выклікаюць нейкіх устойлівых асацыяцый у турыстаў. Там не знойдзеш адметнасцей, здатных заварожваць позірк. І менавіта таму “неадчувальная” спадчына можа быць рэальным чыннікам брэндынгу сваёй малой радзімы, дадаючы прывабныя рысы ў “партрэт” раёна. Дзе-нідзе гэта ўжо адбываецца. Толькі прыклады, на жаль, — пакуль адзінкавыя.

Ілья СВІРЫН

З юбілеем!

Так прыгожа і ўзвышана называецца юбілейная выстаўка народнага мастака Беларусі Віктара Грамыкі, прысвечаная 90-годдзю гэтага выдатнага жывапісца і педагога, якая 3 студзеня ўрачыста, пры вялікай колькасці прыхільнікаў ягонага таленту, адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі.

“Убачыць Зямлю ўсю...”

В.Грамыка. "Восеньскі мажор".

“Убачыць зямлю ўсю” — гэты дэвіз экспазіцыі можна з поўным правам аднесці цалкам да ўсяго мастацтва Віктара Аляксандравіча, бо гэтая Зямля з вялікай літары — галоўная і асноватворная тэма яго мастакоўскага жыцця: зямля, абпаленая агнём вайны і палітая крывёю; зямля, абноўленая пасля Перамогі; зямля і на ёй — чалавек, цудоўны ў сваёй існасці і дабрыні. Канешне ж, Віктар Грамыка перш за ўсё — пясняр подзвігу чалавека на вайне. І гэты подзвіг ён бліскуча адлюстраваў не толькі ў сімволіка-алегарычных шматфігурных палотнах, але і ў “карцінных” пейзажах-сімфоніях, якія ён вар’іраваў у розных эмацыйных ключах, звязаных з памяццю пра пражытае і прачулае ў мінулай вайне, бо нялёгкае партызанскае юнацтва — заўсёды ў ягоным сэрцы. І плынь гадоў гэтае пачуццё не сцірае, а часам нават абвастрае, і тады рука міжволі цягнецца да пэндзля або да пісьменніцкага пяра (успомнім яго цікавую кнігу ўспамінаў “Вясёлка над дарогай”!)...

Віктар Грамыка — рэаліст-рамантык, які выпрацаваў гераічны, узвышаны лад мыслення, дзе жыццёвая праўда неаддзельная ад мары, а эпас — ад пранізлівай лірыкі. Партызанская маладосць падарыла мастаку такую магчымасць, і сама атрымала ў ягоных творах сваё высокаэстэтычнае вытлумачэнне. Таму работы гэтыя заўсёды сучасныя: ад знакамітых палотнаў “Салдаты”, “1941 год. Над Прыпяццю”, “Песня пра мой атрад”, “Яблыкі ўраджаю 1941 года” да карцін “Ільны беларускія”, “Чырвоныя землі Полаччыны”, “Над старымі акопамі — цішыня”, “І неба над намі”, “Дарога на Лепель”, “Вясёлка над храмам”, “Васіль Быкаў. Роздум”... Сучаснасць гэтая — у іх адкрытасці, у даверы мастака да гледача, у майстэрстве зрабіць яго даверaным сваіх пачуццяў. У гэтым заключаецца вялікае прынцыповае значэнне і каштоўнасць творчасці Майстра.

У экспазіцыі прадстаўлена больш за 60 твораў: фігуратыўныя карціны, эпічныя і лірычныя пейзажы, псіхалагічныя партрэты сяброў ды блізкіх, эцюды, у тым ліку і самыя даўнія — студэнцкай пары, якія раней мала хто бачыў. Але шмат яго работ засталося “па-за экспазіцыяй” — у іншых музеях Беларусі ды Расіі (таксама ў Траццякоўцы) і ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі Віктара Грамыкі. Нават у такі юбілей не было ніякай магчымасці сабраць усё разам. Але і на сённяшняй выстаўцы можна натхніцца вялікім талентам ды яркай вобразна-пластычнай мовай мастака і разам з ім “убачыць зямлю ўсю”...

На вернісажы віншавальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі, накіраваны В.А. Грамыку ў сувязі з яго 90-годдзем, зачытаў міністр культуры нашай краіны Барыс Святлоў. Таксама мастака павіншавалі вядомыя дзеячы культуры, сябры і калегі. У сваёй прамове Віктар Аляксандравіч сардэчна падзякаваў усім за ўвагу да ягонай творчасці.

Б.К.

АК Афіша "К"

з 5 студзеня — да 12 студзеня

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **"Алтарная скульптура і мастацкія тканіны Беларусі XVII — XIX стст.".**
- **"Сустрэча. Мікалай Фердынандаў і Арманда Рэверон. Дзве гамы аднаго натхнення".**
- **"Рускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XX ст. Фарфор і тканіны".**
- **"Мастакі Парыжскай школы з Беларусі".**
- **"Пабачыць зямлю ўсю..."** (В.Грамыка).
- **"Вайна 1812 года вачыма відавочцаў. Графіка Х.-В. Фон Фабера дзю Фора".**
- **"Марк Шагал: жыццё і каханне".**
- Партрэт Войцэха Пуслоўскага пэндзля Валенція Ваньковіча.
- **Слуцкія паясы** з фонду Нацыянальнага мастацкага музея Літвы.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 87 96.

- Пастаянныя экспазіцыі: "Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
- **"Цярноўнік крэсаў".**
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы",

Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка А.Вярбіцкага. **"Сучаснасць. Былое. Майстар".**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.

Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
- **"Вясельныя традыцыі Усходу. Японія. Індыя. Карэя".**

МУЗЕЙ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Водбліскі ваеннай славы".**
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**
- **"Вайна 1812 г. у гісторыі Мінска".**

Выстаўкі:
- **Да 13** — фотавыстаўка Маргарыты Трэнінай **"Вяртанне".**
- **Да 13** — фотавыстаўка **"Беларускі экватар Аляксандра Дзітлава".**

Дом-музей I З'езда РСДРП *г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
- **"Пасляваенны Мінск у карцінах А.Наліваева".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Мір стары — Мір новы"** (фотавыстаўка).
- **"Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)".**
- **"Баль Залатога веку. Мір"** (гістарычны касцюм).
- **"Пад мірным небам маладая Беларусь"** (жывапіс Аляксея Панцюка-Жукоўскага).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: 8–01770 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02
- Выстаўка **"Твар гісторыі"** (з прыватнай калекцыі Паўла Татарнікава).
- Выстаўка **"Вера, Надзея, Уваскрэсенне".** З Музея Рокішкскага краю (Літва).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.
- Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.
- **"Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа"** (у філіяле "Мікалаеўшчына", у Мемарыяльнай сядзібе "Смольня").
- Выстаўка да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа **"Якуб Колас — народны паэт Беларусі".**
- **"Таямніцы Дома Песняра".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"** (жыццё і творчасць).
- **"Паэт з Нарачанскага краю".**
- **"Ходзіць Сон ля вакон..."** (прысвечана беларускай перадачы "Калыханка").
- **"А.П. Чэхаў. Лінія жыцця"** з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка А.П. Чэхава "Меліхава" (Расія).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"1812 г. Вайна і мір".**

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".** "Зала ўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя). *Вежа палаца*

Экспазіцыя: **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Конны партрэт генерал-фельдмаршала І.Ф. Паскевіча (1874 г.)"** (выстаўка адной карціны з калекцыі Д.Асташонка).
- **"Мінулага прасочваючы ніць..."** (мемуарная літаратура канца XVIII — XX стст.).
- **"Класікі беларускага мастацтва"** (выставачна-адукацыйны праект). *Паўночнае крыло палаца*

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вось зіма прыйшла серабрыстая..."** (работы гомельскіх мастакоў з фондаў).
- Куток жывых экзатычных рэптылій. *Зімовы сад* Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32.

Тэл.: (80232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX ст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца. у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Пад Віфлеемскай зоркай"** (мастацкія творы з перламутру, ражджэсцвенскія паштоўкі канца XIX — пач. XX стст.).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Хайлендэры ў Афганістане: тады і цяпер".**
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.
- Пастаянная экспазіцыя **"Прырода Лідчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.
- Духоўна-асветніцкая выстаўка-кірмаш **"Ражджаство Хрыстова".**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1. Тэл.: 327 26 12.
- **"Бабруйскі варыянт"** (выстаўка керамікі).
- **"Лета ў правінцыі"** (выстаўка жывапісу).

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА ЛЮТЫ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2013 ГОДА!

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Старадаўнія гарады Беларусі ў кнігах і артэфактах"** (да 1150-годдзя Полацка).
- **"Мая Мазыршчына"** (выстаўка да 60-годдзя мастака Мікалая Дубровы).
- **"Цёплая шафа".**
- **"Петрыкаўскі роспіс — перліна Украіны".**
- **"Да 200-годдзя перамогі Расіі ў Айчыннай вайне 1812 г.".**
- **"Антыкварыят. Палацаў страчаная раскоша..."** з прыватнай калекцыі Сяргея Пуціліна.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вось зіма прыйшла серабрыстая..."** (работы гомельскіх мастакоў з фондаў).
- Куток жывых экзатычных рэптылій. *Зімовы сад* Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Выстаўка **"Айчынная вайна 1812 года ў сюжэтах сучаснага мастацтва"** са збору Пушкінскага запаведніка.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
- **"Апякункі паэтычных нябёс"** (пра жанчын-пісьменніц).
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"** (жыццё і творчасць).
- **"Паэт з Нарачанскага краю".**
- **"Ходзіць Сон ля вакон..."** (прысвечана беларускай перадачы "Калыханка").
- **"А.П. Чэхаў. Лінія жыцця"** з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка А.П. Чэхава "Меліхава" (Расія).

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.
- **5 — "Віні-Пух і ўсе, усе, усе"** В.Пятровай. Пач. а 12-й і а 16-й.
- **6 — "Чароўная музыка"** М.Мінкова. Пач. а 12-й.
- **6 — "Жызэль, або Вілісы"** А.Адана. Пач. а 16-й.
- **8 — "Чароўная флейта"** В.А. Моцарта.
- **9 — "Стварэнне свету"** А.Пятрова.
- **10 — "Багема"** Дж.Пучыні.
- **13 — "Вялікі навагодні баль у Вялікім".** Пач. а 21-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 227 60 81.

На сцэне Цэнтральнага Дома афіцэраў:
- **5, 6 — "Ноч на Каляды"** паводле М.Гогаля.
- **13 — "Лістапад. Андэрсен"** А.Паповай.

На сцэне Палаца культуры прафсаюзаў
- **9, 10 — "Людзі на балоце"** А.Паповай.
- **11 — "Пінская шляхта"** В.Дуніна-Марцінкевіча.

На Малой сцэне Канцэртнай залы "Мінск"
- **9 — "Старамодная камедыя"** (меладрама) А.Арбузава.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
- **5, 6 — "Стойкі алавяны салдацік"** паводле Х.К. Андэрсена. Пач. аб 11-й і а 14-й.
- **5 — "Адэль"** Я.Таганава.
- **12, 13 — "Тры Жызэлі"** А.Курэйчыка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **5, 6 — "Чароўны гадзіннік, або Хто выратуе Новы год?"** А.Атрашкевіч. Пач. аб 11-й і а 14-й.
- **5 — "Чароўны свет аперэты".** Канцэртная праграма.
- **12, 13 — "Асоль"** У.Саўчыка.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **5, 6, 8** — Навагодняя праграма **"Новы год у Церамку".**
- **15 — "Ямелева шчасце".**

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ
Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.
Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ
Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон/факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 7934
04.01.2013 у 19.30
Замова 66
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

Дырэктар — ПРЫКО Алег Васільевіч
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна
Намеснік дырэктара па маркетынгу — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Тэл.: (017) 290 22 50 (прыёмная).
Бухгалтэрыя: тэл.: (017) 334 57 35

9 771994 478007 13001